Наша ніва

17.09.2018

# Міжнародная выстава «Беларусь і Біблія»




20 верасня - 21 кастрычніка

З 20 верасня па 21 кастрычніка ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі будзе праходзіць міжнародная выстава «Беларусь і Біблія», прысвечаная самай вядомай і ўплывовай кнізе ў гісторыі чалавецтва — Бібліі.

На выставе будуць дэманстравацца 170 унікальных рукапісных і друкаваных помнікаў кніжнай культуры, сабраных з 11 дзяржаўных і прыватных калекцый ЗША, Вялікабрытаніі і Ізраіля, а таксама прадастаўленыя Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі.

Сярод экспанатаў:

- скруткі Мёртвага мора,

- самы старажытны фрагмент Новага Запавету,

- рэканструкцыя друкарскага станка Гутэнберга 15 стагоддзя,

- кнігі Гутэнберга, Марціна Лютара і Францыска Скарыны,

- гравюры Альбрэхта Дзюрэра, Гюстава Дорэ, Сальвадора Далі.

Некалькі раздзелаў выставы будуць прысвечаныя гісторыі Бібліі ў Беларусі.

На выставе будзе дзейнічаць інтэрактыўная пляцоўка для дзяцей і друкарскі станок Гутэнберга, на якім кожны ахвотны зможа надрукаваць аркуш з Бібліі. Таксама ў межах выставы пройдуць займальныя і пазнавальныя экскурсіі і выступленні сусветна вядомых экспертаў.

На адкрыццё выставы, якое адбудзецца 20 верасня, запрошаны вядомы хрысціянскі публіцыст і прапаведнік Джош Макдауэл, аўтар бэстсэлераў «Не проста цясляр», «Бясспрэчныя сведчанні» і яшчэ 150 кніг.

Выстава працуе ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (пам.347)

**Час працы:**

Аўторак, серада, пятніца: 10:30-19:00

Чацвер, субота, нядзеля: 10:00-18:00

Выходны дзень — панядзелак.

**20 верасня  Музей кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі**